**24.** Выберыце з дадзеных словазлучэнні *“прыслоўе + прыметнік (дзеепрыметнік)”*:

*1) грамадска карысны; 2) жыццёва праўдзівы; 3) добра падрыхтаваны;*
*4) вечназялёныя дрэвы; 5) дастаткова вядомы; 6) аб’ектыўна магчымы.*

**А)** няма правільных варыянтаў. **Б)** усе прыклады.
**В)** усе прыклады, акрамя 4. **Г)** 1, 3, 5. **Д)** 2, 4, 6.

**25.** У якіх прыкладах правільна напісаны зборныя лічэбнікі?

*1) чацвёра нажніц; 2) двое дзвярэй; 3) шэсцера вучняў;*
*4) пяцёра гусей; 5) семера казлянят.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2, 4. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 4, 5.

**26.** Вучні запісвалі словазлучэнні: Васіль – *не выканаць праз ляноту*; Ілья – *мара пра шчасце;* Лук’ян – *дом на пяць паверхаў.*
Хто правільна выканаў заданне?

**А)** усе вучні. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** Васіль, Ілья.
**Г)** Васіль, Лук’ян. **Д)** Ілья, Лук’ян.

**27.** У якіх сказах паміж дзейнікам і выказнікам на месцы пропуску неабходна паставіць працяжнік?

*1) А ён _ сведка часу, так і расце на ўзлессі.*
*2) Ён са мною _ аднагодка. 3) Прырода Беларусі _ багатая і разнастайная.*
*4) Мноства казак _ разышлося па свеце. 5) Воблакі _ нібы казачныя героі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**28.** Дадзены сказы: *1) Макар, як сын лесніка, вельмі добра ведаў лес.*
*2) Першыя вестуны вясны, шпакі весела шчабяталі, седзячы на галінках дрэў.*
*3) Памаўчаўшы, ветэран зноў пачаў расказваць.*
У якім сказе дапушчана пунктуацыйная памылка?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** усе сказы запісаны правільна. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**29.** Вызначце словазлучэнні са словамі-амонімамі:

*1) план будаўніцтва – на пярэднім плане карціны;*
*2) умовы працы – у навуковай працы;*
*3) гасцінная гаспадыня – гасцінная сустрэча.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**30.** Хто з’яўляецца аўтарам наступных радкоў?

*Жытнёвае поле, лясы і азёры,*
*Крынічанька ў лузе і ў небе жаўрук –*
*Услухайся толькі – усё тут гаворыць:*
*Люблю цябе, Белая, Белая Русь…*

**А)** У. Карызна. **Б)** В. Зуёнак. **В)** М. Танк. **Г)** А. Бачыла. **Д)** П. Макаль.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218; тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53;
e-mail: info@bakonkurs.by; http://www.bakonkurs.by/
ГА «БА «Конкурс». Заказ 15. Тыраж 29000 экз. г. Мінск. 2013 г.

# Конкурс па беларускай мове
# **«БУСЛІК-2013»**

*Чацвер, 21 лютага 2013 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Якую расліну ў народзе часта называюць *“кветкай сонца”*?

**А)** рамонак. **Б)** сланечнік. **В)** часнок. **Г)** чыстацел. **Д)** дзьмухавец.

**2.** Якія з прыведзеных назоўнікаў абазначаюць хлебныя злакі?

*1) кроп; 2) пшаніца; 3) авёс; 4) жыта; 5) ячмень.*

**А)** няма правільных варыянтаў. **Б)** усе варыянты.
**В)** усе варыянты, акрамя 1. **Г)** 1, 3, 5. **Д)** 2, 4.

**3.** Выберыце правільна запісанае словазлучэнне:

*1) краўчышынава работа; 2) работа краўчыхі; 3) краўчынава работа.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**4.** Якую назву мела вёска, у якой адбываліся падзеі з аповесці Янкі Брыля “Сірочы хлеб”?

**А)** Вязынка. **Б)** Ракуцёўшчына. **В)** Галынка. **Г)** Багацькаўшчына. **Д)** Боркі.

**5.** Аўтарам зборніка “Вянок” з’яўляецца … .

**А)** Максім Танк. **Б)** Максім Багдановіч. **В)** Максім Лужанін.
**Г)** Уладзімір Караткевіч. **Д)** Пімен Панчанка.

**6.** Колькі слоў з розным лексічным значэннем можна скласці з літар слова *кошык*?

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**7.** У якім словазлучэнні назоўнік мае канчатак **-у**?

*1) кветка рамонк..;   2) ля тэніснага корт..;*
*3) лекавы настой рамонк.. .*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**8.** *Керамічныя пліткі для абліцоўкі печаў, камінаў, сцен у памяшканнях* здаўна называюцца … .

**А)** цэгла. **Б)** столь. **В)** кафля. **Г)** паркет. **Д)** ламінат.

**9.** Выберыце з дадзеных правільна запісаныя словы:

*1) грамматыка;  2) массаж;  3) саванна;*
*4) перрон;  5) тэлеграмма;  6) манна.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2, 4.
**Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 6.

**10.** Прыметнікі *невычэрпны, незлічоны* з’яўляюцца … .

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** амонімамі. **Г)** амографамі. **Д)** паронімамі.

**11.** Колькі разоў ужыта літара **я**, якая мае адзін [а] у словах вершаваных радкоў Галіны Каржанеўскай?

*Назбіраю лісцяў я*
*У двары,*
*Што зляцелі з клёніка*
*Без пары.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**12.** Якія словы маюць канчатак?

*1) уночы;  2) звонка;  3) удалечыні;*
*4) надзея;  5) вільготны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2, 3. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**13.** Дадзены сказы:

*1) Па двары важна ішла белая гусь.*
*2) Сонечныя промні пранізвалі лясны гушчар.*
*3) Ціха шумела лістамі маладая тапаля.*

У якім сказе дапушчана памылка ў дапасаванні прыметніка да назоўніка?

**А)** усе сказы запісаны правільна. **Б)** памылка дапушчана ў кожным сказе.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**14.** У якіх сказах з прапанаваных часціца **не** са словамі пішацца асобна?

*1) Круцячы, свет пройдзеш, але назад (не) вернешся.*
*2) Скруха бядзе (не) памочнік.*
*3) Каля ракі былі (не) пралазныя зараснікі арэшніку.*
*4) Ехаць (не) вельмі доўга.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** ва ўсіх сказах, акрамя 3. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**15.** Выберыце словы, якія пішуцца праз злучок:

*1) (што) дзень; 2) (абы) хто; 3) пакуль (што)*
*4) прыйшоў (такі); 5) (абы) якавы.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**16.** У якім словазлучэнні залежнае слова прымыкае да галоўнага?

*1) бацькаў наказ; 2) глянуць спадылба; 3) спяваць з намі.*

**А)** ва ўсіх словазлучэннях. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**17.** *Прамежак часу ў дзесяць дзён; трэцяя частка месяца* называецца … .

**А)** квартал. **Б)** семестр. **В)** угоддзе. **Г)** чвэрць. **Д)** дэкада.

**18.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску неабходна напісаць літару **ы**?

*1) др..вотня;  2) ябл..чны;  3) гл..ток;*
*4) бр..зент;  5) д..рыжабль;  6) д..рыжор.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3, 4.
**Г)** 2, 3. **Д)** 4, 5, 6.

**19.** Выберыце з дадзеных назоўнікі, у якіх на месцы пропуску неабходна напісаць апостраф:

*1) бул..ён;  2) кар..ер;  3) легкавер..е;  4) кампан..ён;  5) адмоў..е.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4, 5.

**20.** Выберыце з прапанаваных словы, якія маюць прыстаўку:

*1) наймენш;  2) ушчыльную;  3) абы-які;  4) надбаўка.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**21.** Вызначце словазлучэнне, у якім падкрэсленае слова ўжыта правільна:

*1) <u>каларыйная</u> мова;  2) <u>рашчыніць</u> дзверы;  3) <u>лекавая</u> фізкультура.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**22.** Дадзены назоўнікі:

*1) дубняк;  2) туман;  3) падлога;  4) хвоя;  5) песня.*

Якія словы ў форме адзіночнага ліку меснага склону маюць канчатак **-е**?

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4, 5.

**23.** Якія складаныя прыметнікі з прапанаваных напісаны правільна?

*1) бела-снежны;  2) леса-пільны;  3) вуглепрамысловы;  4) лёгкаатлетычны.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 3, 4. **Д)** 2, 3.